# САЦЫЯЛЬНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ДЗЯЦЕЙ У БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***І. В. Лебедзева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, Lebedzeva@mail.ru*

Аналізуюцца працэсы пераходу беларускага грамадства ад традыцыйнага да індустрыяльнага шляху развіцця. Адзначана, што ў сувязі з імклівымі працэсамі трансфармацыі сацыяльнай структуры адпаведныя змены адбываюцца ў становішчы дзяцей. Зроблена выснова аб тым, што пад уздзеяннем гэтых працэсаў спачатку па ініцыятыве органаў улады, а потым і пры удзеле розных прыватных аб'яднанняў быў легітымна аформлены інстытут дзяцінства і сфарміраваны комплекс мер па абароне жанчын і дзяцей.

***Ключавыя словы:*** Беларусь; індустрыяльнае грамадства; радзільныя прытулкі; законы об дзецях; ясли; інстытут дзяцінства; апёка; рамесныя вучылішчы; народныя і царкоўнапрыхадскія школы; прыхадскія вучылішчы.

# СОЦИАЛЬНЫЕ МЕРОПРИЯТИЯ В ОТНОШЕНИИ ДЕТЕЙ В БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

***И. В. Лебедева***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Lebedzeva@mail.ru*

Анализируются процессы перехода белоруского общества от традиционного к индустриальному пути развития. Отмечено, что в связи со стремительными процессами трансформации социальной структуры соответствующие изменения происходят и в семье. Сделан вывод о том, что под влиянием этих процессов первоначально по инициативе органов власти, а потом и при участии различных частных объединений был легитимно оформлен институт детства и сформирован комплекс мер по защите женщин и детей.

***Ключевые слова:*** Беларусь; индустриальное общество; родильные приюты; законы о детях; ясли; институт детства; призрение; ремесленные училища; народные и церковноприходские школы; приходские училища.

# SOCIAL ACTIVITIES FOR CHILDREN IN BELARUS AT THE END OF THE 19TH AND BEGINNING OF THE 20TH CENTURIES

***I. V. Lebedeva***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus,*
*Lebedzeva@mail.ru*

The processes of transition of Belarusian society from the traditional to the industrial path of development are analyzed. It is noted that in connection with the rapid processes of transformation of the social structure, corresponding changes are taking place in the family. It

is concluded that under the influence of these processes, initially at the initiative of the authorities, and then with the participation of various private associations, the institution of childhood was legitimately formalized and a set of measures was formed to protect women and children.

***Keywords:*** Belarus; Russian Empire; children; childhood; social history; transformation process; children's shelter; civil guardianship orders; a source; legislative documents; statistics; publicist; works of art; everyday life.

Эпоха мадэрнізацыі, якая пачалася ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст., змяняла не толькі эканоміку, але і істотна трансфармавала традыцыйны уклад як гарадскога, так і сялянскага асяродку. Паступова разбураўся звыклы лад жыцця, паслабляліся нормы патрыярхальнай сям'і. У 1880–1890-я гг. – у перыяд радыкальных зменаў у эканоміцы – былі выданы першыя законы, якія рэгламентавалі дзіцячую працу, пачала фарміравацца своеасаблівая спажывецкая культура, якая датычылася толькі дзяцей заможных бацькоў, актыўна разгортвалася дабрачынная дзейнасць, пачыналі прымяняцца навуковыя падыходы да праблем дзяцінства ў псіхалогіі, педыятрыі і, асабліва, у педагогіцы. Усе гэтыя навацыі фарміраваліся ў Беларусі пад уплывам заходніх ідэй развіцця індустрыяльнага грамадства.

На думку прафесара А. Г. Каханоўскага, сацыяльныя змены, што адбываліся ў Беларусі 60-х гг. XIX – пачатку XX ст., атрымалі сістэмны характар і закранулі практычна ўсе сферы чалавечага жыцця і паводзін і найперш выявіліся ў працэсах дыферэнцыяцыі і стратыфікацыі грамадства, урбанізацыі, павелічэння сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці насельніцтва, пашырэння пісьменнасці і адукацыі, секулярызацыі, росту палітычнай актыўнасці. Рэформы праніклі ў глыбокія слаі традыцыйнай сацыяльнай рэчаіснасці, таму што гэта было падрыхтавана выяўленнем цэннаснай матывацыі [5, с. 213–215].

Неабходна заўважыць, што пад час правядзення рэформ становішча дзяцей у беларускім грамадстве заставалася ранейшым, але гэты перыяд стаў падрыхтоўкай да істотных зменаў у пачатку XX ст. Як заўважае П. Штомпка: «Грамадства, якое адчувае змены, не ўспрымаецца як сутнасць, аб'ект ці сістэма, а ўяўляе сабой сетку адносін, прасякнутую напружаннем і гармоніяй, канфліктамі і адзінствам. Паслядоўнасць падзей у межах кожнага сацыяльнага працэса мае кумулятыўны характар. Кожная фаза ёсць акумуляваны вынік, эфект, крысталізацыя, "пункт прыбыцця" ўсіх папярэдніх фаз і ў той жа час – насенне, … адпраўная кропка для далейшага працэса. У кожны гістарычны момант адчыняецца вызначанае поле магчымасцей, выбараў будучага курса, якое ў значнай меры абмежанавана

папярэднім развіццём працэса» [12, с. 266]. Адчуванне неабходнасці шырокамаштабных зменаў з'явілася і ў грамадстве, і ва ўладных структурах напрыканцы XIX ст. Адпаведна пачынаюць праводзіцца і першыя мерапрыемствы: распрацоўка фабрычнага заканадаўства, накіраванага на абарону не толькі дарослых, але і малалетніх прамысловых работнікаў, па закліку уладаў адбываецца рост выхаваўчых дамоў па ўсёй тэрыторыі краіны, змяняецца іх унутраная структура (рамесныя майстэрні для набыцця малалетнімі сіротамі рабочых спецыяльнасцяў). У 1899 г. з'яўляецца першы сістэматызаваны зборнік пастанаўленняў дзеючага на той момант заканадаўства ў дачыненні да малалетніх і непаўналетніх грамадзян Расійскай імперыі – «Законы аб дзецях», як быў складзены Я. А. Кантаровічам [4].

Органы дзяржаўнай улады і дабрачынныя ўстановы становяцца галоўнымі абаронцамі правоў дзяцей і іх маёмасці. Звычайнай справай становяцца звароты саміх дзяцей за абаронай сваіх маёмасных правоў ад бацькоў і родзічаў. Так, да разгляду ў сіроцкі суд г. Мінска непаўналетнія дзеці Антаніны Васілеўскай – Каспер і яго два браты – падалі прашэнне са скаргай на сваю маці, якая пасля ўзяцця другога шлюбу разам са сваім мужам «пачалі траціць нашу маёмасць, прадалі каня, кароў і сталі браць грошы пад дамы, а нас утрымліваць амаль голымі і галоднымі, выганяючы безчалавечым біццём з дому…». Такім чынам, яны былі вымушаны шукаць прытулку ў родзічаў, а за зварот у суд старэйшы сын быў збіты маці жалезным прутом да паўсмерці і выгнаны з дому. Каспер Васілеўскі звярнуўся да Мінскага гарадскога галавы графа К. Э. Чапскага з просьбай замены апякуноў, якія дрэнна наглядалі за яго з двума братамі і маёмасцю, якая засталася ад памерлага бацькі. У першым слуханні было адказана ў замене апекуноў, але іх прынудзілі весці справаздачнасць. На наступны зварот Каспера суд задаволіў яго прашэнне і прызначыў новага апекуна [4, л. 1–4].

Да ўвядзення земстваў на тэрыторыі беларускіх губерняў кантроль за медыцынскімі ўстановамі ажыццяўлялі мясцовыя прыказы грамадскай апекі. На пачатку 1860-х гг. дзейнічала 58 лякарняў і 2 аддзяленні, разлічаныя на 2 171 месца [7, с. 167]. Поруч з «прыказнымі» медыцынскімі ўстановамі існавалі таксама грамадскія і прыватныя. Медыцынскае абслугоўванне дзяцей-сірот, дзяцей з бедных сем'яў ажыццяўлялася ў дзіцячых прытулках. З мэтай памяншэння дзіцячай смяротнасці ва ўзросце да  года з канца XIX ст. на тэрыторыі Беларусі, як і па ўсей Расійскай імперыі, адчыняюцца радзільныя прытулкі. Так, у Мінску ў маі 1895 г.

пачаў працу гарадскі бесплатны прытулак для жонак салдат, чорнарабочых, слесараў, незамужніх жанчын, якія працавалі прачкамі, кухаркамі, нянькамі і інш., жанчын, якія знаходзіліся пад следствам або былі арыштаваныя. Першапачаткова ён размяшчаўся ў доме графа К. Э. Чапскага. У 1911 г. колькасць месцаў было прыкладна 19, медыцынскі персанал складаўся з доктара і 3 акушэрак. У 1911 г. паслугамі прытулка карысталіся каля 578 жанчын. Фінансіраванне прытулка адбывалася за кошт земства і дабрачыннасці. Загадвала прытулкам ганаровая папячыцельніца, якая сачыла за медыцынскім персаналам, санітарным становішчам установы, з'яўлялася арганізатарам дабрачынных збораў. Спецыфіка арганізацыі працы прытулка заключалася ў тым, каб захоўваць не толькі здароўе жанчыны, але і перадухіліць смерць нованароджанага немаўляты. Пры немагчымасці жанчына мела магчымасць пакідаць дзіця ў прытулку. Справаздачы ўстановы, аднак, сведчылі, што часцей жанчыны забіралі сваіх дзяцей [1].

У другой палове XIX ст. у Расійскай імперыі па прыкладу шэрагу еўрапейскіх краін з'яўляюцца новыя ўстановы для дзённага знаходжання дзяцей – яслі. Грамадскія дзеячы таго часу класіфікавалі іх па трох тыпах: гарадскія, арганізаваныя для жанчын-падзёншчыц, фабрычныя і сялянскія [11, с. 34. ]. Арганізацыя сельскіх яслей мела часовы, сезонны характар, – як правіла, на перыяд гаспадарчых работ летам прыкладна на паўтары месяцы. Гарадскія яслі, у тым ліку арганізаваныя пры фабрыках і заводах, як правіла, функцыянавалі на пастаяннай аснове. Дзеці прымаліся на працягу ўсяго года за выключэннем выхадных і святочных дзён.

Прыкладам менавіта такога тыпу ўстаноў на тэрыторыі Беларусі можна лічыць дзіцячы дзённы прытулак «Яслі», які быў адчынены 17 студзеня 1905 г. у г. Мінску намаганнямі Таварыства абароны жанчын і старшыні Камісіі па справах прытулка «Яслі» В. Я. Жэсковай. Прытулак быў разлічаны на дагляд дзяцей ва ўзросце ад 2,5 да 7 гадоў на працягу ўсяго працоўнага дня іх бацькоў, прымаліся дзеці ўсіх веравызнанняў. Сродкі для адкрыцця гэтай дабрачыннай установы былі сабраны ад членскіх узносаў, ахвяраванняў, субсідый таварыстваў і прыватных асоб; арганізатары звярталіся за фінансавай дапамогай да Мінскай гарадской управы.

Першапачаткова жанчыны, як гэта заўсёды адбываецца ў дачыненні любых новаўвядзенняў, адносіліся да прытулку з вялікім недаверам, аднак да канца другога месяца існавання ўстановы на 27 месцаў паступіла 60 заяваў жанчын, жадаючых уладкаваць сваіх дзяцей ў яслі. Ужо праз 6

месяцаў колькасць прынятых дзяцей вызначылася лічбай 32 (14 яўрэйскіх і 18 хрысціянскіх дзяцей) [3, л. 1–3].

У 1912 г. існавала ўжо 2 аддзялення прытулку, колькасць дзяцей, якія наведвалі яго, складала: 16 224 хрысціян і 10 058 яўрэяў. У параўнанні з 1911 г. колькасць дзяцей павялічылася на 3 927 чалавек. Кошт утрымання аднаго дзіця ў дзень ў 1912 г. вызначаўся ў 12, 3 капейкі, пры гэтым колькасць прыватных ахвяраванняў на карысць прытулку толькі за 1912 г. склала 583 руб. Мінская грамадская супольнасць вельмі ахвотна ўдзельнічала ў справе грашовага і рэчавага падтрымання гэтай дабрачыннай установы. Сярод іншых рэгулярнымі ўнёскамі вызначаліся М. В. Доўнар-Запольскі, Я. А. Наркевіч-Ёдка і інш. [6, л. 1–3]. Натуральна, што матэрыяльнае становішча жанчын, якія звярталіся за дапамогай яслей, было цяжкім. Заняткамі жанчын-хрысціянак былі праца на фабрыцы, самая прымітыўная, падзённая работа з вельмі маленькімі заробкамі. Яўрэйкі займаліся разносным гандлем, некаторыя працавалі на гільзавай фабрыцы, некаторыя браліся за нехарактэрную для іх працу – мыццё бялізны, ад якой аблазіла скура з рук. Жанчыны, якім прыходзілася з'яўляцца на працу ў 4 гадзіны раніцы, прасілі пакідать сваіх дзяцей у прытулку на ноч, каб не падымаць іх так рана з пасцелі.

Прытулак «Яслі» ажыццяўляў медыцынскі агляд кожнага дзіцяці пасля прыходу, выдаваў казённае адзенне, прычым часцяком яно было значна больш прыгожым, чым уласнае. Далей дзяцей чакалі ранішняя гарбата і навучанне буквару і лічэнню. Некаторыя праз пару месяцаў завучвалі нават некалькі вершаў на памяць. У 12 гадзін дзяцей кармілі, звычайна гэта былі мясны суп і каша. Час пасля абеду праходзіў у гульнях і розных занятках пад кіраўніцтвам дзяжурных дам, меліся таксама два перапынкі для прыняцця гарбаты і малака. Зразумела, што пры такім распарадку дня дзеці ў яслях адчувалі сябе значна камфортней і вельмі часта не жадалі ўвечары вяртацца да дому, дзе ўмовы жыцця былі значна горшымі. Спакойнымі былі і маці, ўпэўненыя ў надзейным і бясплатным даглядзе за дзецьмі пад час іх занятасці на працы. Таму гэтая дабрачынная ўстанова з самага яе адкрыцця карысталася вялікім попытам у насельніцтва.

Падобныя ўстановы нагляду за малалетнімі былі арганізаваны на пачатку XX ст. амаль ва ўсіх губернскіх цэнтрах. Так, у справаздачах Віцебскага таварыства апекі аб дзецях за 1904–1915 гг. паведамлялася, што ў 1908 г. штодзень прытулак пад назвай «Прыстанішча» наведвала 20–25 дзяцей, на працягу года гэтая лічба складала прыкладна 7 300 наведвальнікаў [10, л. 26–27]. У справаздачы за 1913 адзначалася, что

набытае ў 1912 г. уласнае памяшканне «Прыстанішча» акрамя «…клапотнага пытання аб найму зручнага для прытулка памяшкання дала дзецям магчымасць у добрае надвор’е карыстацца садам пры будынку, што дзеля задач фізічнага выхавання мела вялікае значэнне. У цёплае надвор’е дзеці праводзілі час ў садзе, нават прымалі там ежу, … што садзейнічала відавочнаму аздараўленню дзяцей…» [10, л. 64–64 ад.].

Найбольш актыўную дзейнасць сярод паўдзяржаўных устаноў працягвала праводзіць Ведамства ўстаноў імператрыцы Марыі. Да канца XIX ст. дзіцячыя прытулкі працавалі не толькі ва ўсіх губернскіх цэнтрах, але і некаторых павятовых гарадах. Пад уздзеяннем працэсаў трансфармацыі беларускага грамадства з’яўляюцца і новыя патрабаванні да гэтых устаноў: прытулкі зараз ажыццяўляюць не толькі бясплатнае ўтрыманне і адукацыю для сваіх выхавальнікаў, але і арганізоўваюць прафесійнае навучанне дзяцей для далейшага працаўладкавання. У Мінскім прытулку ў 1902 г. была арганізавана майстэрня жаночых і дзіцячых сукенак. Дзяўчынкі навучаліся тут шыццю пад кіраўніцтвам настаўніцы рукадзелля і прафесійнай швачкі. У гэтым годзе было выканана заказаў на 128 руб. 25 кап. Акрамя знешніх заказаў дзяўчынкі шылі вопратку для прыюта. Характэрна, что атрыманыя грошы, за пакрыццём расходаў майстэрні, размяркоўваліся паміж служачымі і старэйшымі дзяўчынкамі, якія працавалі ў майстэрні, і ўносіліся ў ашчадныя кніжкі. Паколькі дадзеная дабрачынная ўстанова не мела магчымасці арганізаваць рамеснае аддзяленне, выхаванцаў-хлопчыкаў адміністрацыя за ўласны кошт з выдаткамі на абмудзіраванне ўладкоўвала ў Мінскае рамеснае вучылішча Міністэрства народнай асветы [2, с. 7–9]. Такім чынам, прытулак даваў магчымасць сваім выхаванцам атрымаць закончаную рамесную адукацыю для далейшага іх забяспечанага самастойнага жыцця.

Працэсы трансфармацыі паступова ахоплівалі ўсе сферы жыцця і слаі насельніцтва. Не маглі яны не закрануць і сялянства: змены ў іх занятках і ў сацыяльнай структуры, працэсы па набыцці пачатковай адукацыі, адыходніцтва і г. д. Калі раней нагляд за сялянскімі непаўналетнімі сіротамі ажыццяўлялі сацыяльныя арганізацыі ўнутры сялянства, то ў пачатку XX ст. у гонар 300-годдзя дынастыі Раманавых у няземскіх губернях былі арганізаваны спецыяльныя камітэты па апецы дзяцей сялянскага насельніцтва. Задачай такіх камітэтаў з’яўлялася апека «… сірот сялянскага насельніцтва без адрозненняў плямён, стану, саслоўяў і веравызнанняў, а таксама аб’яднанне ўрадавай, грамадскай і прыватнай дзейнасці ў гэтым накірунку» [9, л. 9]. Камітэты не ажыццяўлялі непасрэднай грашовай

дапамогі ні самім сіротамі, ні іх родным, а выдавалі грошы на ўтрыманне іх у інтэрнатах пры пачатковых вучылішчах і пры ўсіх школах, дзе праводзілася навучанне прыкладным ведам і ўменням. Земскім начальнікам рассылаліся адпаведныя лісты з просьбай сабраць звесткі па паветах і валасцях аб колькасці сялянскіх дзяцей ад 2 да 12 гадоў, маючых патрэбу ў апецы. Кожны зварот за дапамогай разглядала спецыяльная камісія, шмат прашэнняў задавальняліся, але калі камісія лічыла матэрыяльны стан жыцця бацькоў ці апекуноў здавальняючым, падазравала іх у банальным жаданні пазбавіць сябе ад дзяцей. І такім грамадзянам было адмоўлена ў аказанні паслуг.

Такім чынам, у пачатку XX ст. у Беларусі значна пашырылася сетка дабрачынных устаноў. Калі на пачатку і ў сярэдзіне стагоддзя клопат па іх арганізацыі бралі на сябе дзяржаўныя ўстановы, то напрыканцы, і асабліва ў пачатку XX ст., гэта былі ўжо разнастайныя грамадскія аб’яднанні: таварыствы і грамадствы па ахове жанчын і дзяцінства. У гэты час адбываецца ўдасканаленне дзейнасці прытулкаў, яны не проста ажыццяўляюць дагляд за непаўналетнімі сіротамі, але і імкнуцца даць ім прафесію для далейшага жыцця ў свеце дарослых. Тлумачыцца такая з’ява трансфармацыяй грамадства, у першую чаргу, размыццём саслоўнай структуры насельніцтва. Ва ўмовах традыцыйнага грамадства ролю наглядальнікаў і выхавальнікаў сіротаў і безпрытульных малалетніх бралі на сябе прадстаўнікі саслоўна-карпаратыўных арганізацый, а пры пераходзе да мадэрну і разрушэнні традыцыйных сацыяльных інстытутаў саслоўнай апекі і нагляду сялянскай грамады ўзнікла патрэба у распрацоўцы новай заканадаўчай сістэмы па ахове сіроцтва. Клопат па ўладкаванні беспрытульных, бездаглядных малалетніх і дзяцей-сіротаў бралі на сябе дзяржаўныя органы праз арганізацыю разгалінаванай сеткі дабрачынных устаноў. Пільны нагляд за іх дзейнасцю дзяржава заахвочвала і падтрымлівала рух грамадскіх аб’яднанняў і таварыстваў у арганізацыі прыватных дабрачынных устаноў: шпіталёў, яслей, прытулкаў, рамесных школ і майстэрняў.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Анкеты на рожениц 1899–1911 // НГАБ. Ф. 500. Воп. 1. Спр. 3.
2. Вестник благотворительности. СПб. Г. 6. № 9. С. 7–9.
3. Дело о выдаче пособий детскому приюту «Ясли» // НГАБ. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4267.
4. Законы о детях. Сборник постановлений действующего законодательства, относящихся до малолетних и несовершеннолетних с приложением Свода разъяснений по кассационным решениям Сената / Сост. Я. А. Канторович. СПб., 1899.

5. Каханоўскі А. Г. Сацыяльныя аспекты мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі (60-я гг. XIX – пачатак XX ст. ) // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. Минск: БГУ, 2004.

6. Материальный отчет и личный состав правления приюта за 1912 г. // НГАБ. Ф. 1206. Воп. 1. Спр. 1.

7. Моторова Н. С. Социальная политика Российской империи на территории Беларуси (1861–1914). Минск: Национальная библиотека Беларуси, 2019.

8. Об опеке над малолетними детьми умершего минского мещанина Фадея Василевского и его имуществом // НГАБ. Ф. 19. Воп. 1. Спр. 1019.

9. Об образовании особого комитета по призрению сирот сельского населения в Гродненской губ. по случаю 300-летия царствования Дома Романовых. 7 мая 1914 – 14 мая 1915 // НГАБ у г. Гродна. Ф. 17. Воп. 1. Спр. 430.

10. Отчеты Витебского общества попечения о детях за 1904–1910, 1913, 1915 гг. // НГАБ. Ф. 2649. Воп. 1. Спр. 45.

11. Русских Н. А. Попечение о детях грудного возраста в России // Труды Первого Всероссийского съезда детских врачей в С. -Петербурге с 27–31 декабря 1912 года / Под ред. Г. Б. Конухеса. СПб.; Орг. ком., 1913.

12. Штомпка П. Социология социальных изменений / Пер. с англ. Под ред. В. А. Ядова. М.: Аспект Прогресс, 1996.